This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.73-83

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251003

Data przesłania: 13.05.2025
Data akceptacji: 17.06.2025

**Кірыл Даўматовіч**
незалежны даследчык
killdjek1628@gmail.com
ORCID: 0009-0003-2104-0386

# Асаблівасці функцыянавання Сойма Вялікага Княства Літоўскага ў 1530-ыя гг. на прыкладзе дзейнасці гаспадарскага пасла Івана Гарнастая

**Specyfika funkcjonowania Sejmu Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 30. XVI w. na przykładzie działalności posła hospodara Iwana Hornastaja**

Artykuł poświęcony jest problemom funkcjonowania Sejmu Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 30. XVI wieku. Cechy funkcjonowania Sejmu WKL w tym okresie zostały ukazane na przykładzie działalności posła hospodarskiego Iwana Hornostaja. Autor pokazał specyficzną praktykę w parlamentaryzmie Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1500–1530, kiedy to wielki książę Zygmunt Stary był nieobecny w państwie, a jego interesy reprezentowali posłowie hospodara. W latach trzydziestych XVI wieku funkcje tę pełnił Iwan Hornostaj. Artykuł pokazuje stopniowy rozwój kariery politycznej Iwana Hornostaja w Wielkim Księstwie Litewskim, w której można wyróżnić trzy etapy. Autor prześledził również sprawczość Iwana Hornostaja jako posła hospodara. Do jego kompetencji należało utrzymywanie łączności między monarchą a Sejmem WKL, za pomocą którego Zygmunt Stary realizował swoje uprawnienia w zakresie organizacji obronności i finansów, stosunków z Państwem Moskiewskim i Chanatem Krymskim.

Słowa kluczowe: Sejm, Wielkie Księstwo Litewskie, poseł, Iwan Hornostaj, parlamentaryzm

Функцыянаванне Сойма Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) з'яўляецца спецыфічным механізмам палітычнай камунікацыі грамадства ў канцы XV – другой трэці XVI стст. Пры гэтым у гістарыяграфіі да гэтага часу прадстаўляецца даволі агульная карціна дзейнасці Сойма ВКЛ. У лепшым выпадку гаворыцца пра тое, што рашэнні на Сойме прымаліся вялікім князем і Паны-Радай у прысутнаці шляхты, а ўжо ў 1540–1560-ыя гг. шляхта актывізавала сваю палітычную дзейнасць і праз свае «просьбы» атрымлівала на паседжаннях манаршыя «адказы». Пры гэтым амаль нічога невядома пра тых асобаў, якія сапраўды забяспечвалі функцыянаванне прадстаўнічых органаў улады ў ВКЛ асабліва да заключэння Люблінскай уніі летам 1569 г. Дадзеная праблематыка амаль не знайшла адлюстравання ў гістарыяграфіі, што прадвызначае яе актуальнасць на сучасным этапе вывучэння гісторыі парламетарызму ВКЛ.

Кажучы пра палітычную сістэму ВКЛ у эпоху Жыгімона Старога трэба адзначыць пэўную перыядычнасць соймавых паседжанняў. Найчасцей яны былі звязаны з патрэбай арганізацыі войска і фінансаў для супрацьстаяння сусядзям. Сойм з'яўляўся паседжаннем вялікага князя, паноў радных і прадстаўнікоў розных зямель Княства (ураднікі, харунжыя, шляхта). Пры гэтым спецыфічнай рысай соймавых паседжанняў у дадзены час была перыядычная адсутнасць Жыгімонта Старога ў межах ВКЛ, калі ён найчасцей знаходзіўся ў Польскім Каралеўстве. Таму для вырашэння дзяржаўных пытанняў Княства склаўся своеасаблівы палітычны інстытут камунікацыі паміж адсутным вялікім князем і Соймам ВКЛ. Так, на Соймы Жыгімонт Стары адпраўляў сваіх гаспадарскіх паслоў, якія прадстаўлялі пытанні для абмеркавання на паседжаннях або манаршыя пастановы па вырашэнню пэўных праблем. Такім чынам забяспечвалася сімвалічная «прысутнасць» вялікага князя на агульнадзяржаўных паседжаннях у ВКЛ. Дадзеныя пасольствы ў часы Жыгімонта Старога рэалізоўвалі ўладныя кампетэнцыі манарха ўнутры палітычнай прасторы Ягелонаў у цэнтральнай

і ўсходняй Еўропе. Таму ў склад пасольстваў уваходзілі ў першую чаргу давераныя людзі, якія валодалі аўтарытэтам, кампетэнцыямі і сацыяльным статусам. Варта падкрэсліць, што Паны-Рада таксама адпраўлялі пасольства да манарха ў Польскае Каралеўства для канчатковага вырашэння некаторых пытанняў.

Структура Сойма ВКЛ у першую чаргу ўключала вышэйшых ураднікаў, якія ўваходзілі ў склад Паны-Рады. Сярод іх вылучаюцца япіскапы, ваяводы, старасты, кашталяны, маршалкі, а таксама дваравыя ўраднікі (чашнік, крайчы, канюшы). Пры гэтым трэба заўважыць, што ў склад радных паноў уваходзілі некаторыя княжацкія роды, такія, напрыклад, як слуцкія князі Алелькавічы. Акрамя гэтага на соймавых паседжаннях прысутнічалі прадстаўнікі розных зямель Вялікага Княства. Сярод іх былі ўраднікі сярэдняга звяна (харунжыя, дзяржаўцы) і розныя групы феадалаў (шляхта, зямяне, баяры). Узначальваў гэтае паседжанне асабіста вялікі князь. У Польскім Каралеўстве пры наяўнасці выбранага манарха паседжанне Сойма без яго ўдзела ўспрымалася грамадствам не ў поўнай меры легітымным. Галоўную ролю ў парламенцкім жыцці сярод польскіх ураднікаў адыгрывалі прымас падчас элекцыйнай кампаніі і маршалак непасрэдна падчас паседжанняў Сойма. Пры гэтым роля ўраднікаў у соймавых кампанях ВКЛ дагэтуль дэталёва не даследавана ў гістарыяграфіі.

Гаспадарскія пасольствы як палітычны інстытут у парламенцкай практыцы ВКЛ функцыянавалі яшчэ да дзейнасці Івана Гарнастая. Так, на Віленскі Сойм 1509 г. Жыгімонт Стары са Львова адправіў пасольства ў складзе дворнага маршалка Рыгора Осцікавіча, маршалка і віленскага ваяводзіча Яна Мікалаевіча, маршалка Яна Літавора, маршалка і ахмістра Войцеха Янавіча, земскага падскарбія і пісара Богуша Багавіцінавіча[1]. У пачатку 1520-х гг. «прысутнасць» манарха ў Вялікім Княстве забяспечвалі гарадзенскі староста

[1] Н.А. Максимейко, *Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. Приложение,* Харьков 1902, с. 14.

Юры Мікалаевіч Радзівіл, а таксама земскі падскарбій, маршалак, пісар і камянецкі дзяржаўца Богуш Багавіцінавіч[2]. У 1523–1524 гг. падчас Віленскага Сойма гэтую функцыю выконваў сакратар Мікалай Вяжгайла[3]. Аднак ужо на Берасцейскі Сойм 1524 г. і Віленскі Сойм 1526 г. да Мікалая Вяжгайлы, павышанага да кіеўскага япіскапа, быў прыстаўлены пісар Іван Гарнастай[4].

Такім чынам, у 1500–1520-ыя гг. у парламенцкай практыцы ВКЛ склалася пэўная працэдура камунікацыі паміж адсутным у дзяржаве Жыгімонтам Старым і Соймам. Уладныя паўнамоцтвы вялікага князя рэалізоўваліся праз гаспадарскія пасольствы, у склад якіх уваходзілі найбольш давераныя асобы манарха. Дадзеная практыка расцягнулася на некалькі дзесяцігоддзяў. Менавіта ў гэты перыяд распачынае сваю палітычную кар’еру Іван Гарнастай, які на працягу 1530-х гг. забяспечваў камунікацыю паміж адсутным у Княстве Жыгімонтам Старым і Соймам ВКЛ.

Сваю кар’еру Іван Гарнастай пачаў у 1513 г. з пасады пісара ў «рускім» аддзеле канцылярыі ВКЛ («да жывата» па прывілею 15 ліпеня 1513 г.)[5]. Аднак ў маі-чэрвені 1516 г. у сувязі з рэарганізацыяй канцылярыі ён быў зняты з гэтай пасады[6]. Ужо у чэрвені 1517 г. Іван Гарнастай выступаў у ролі каралеўскага пасла ў перамовах з крымскім ханам Махметам Гірэем, а ў снежні 1518 г. атрымаў тытул шляхціца[7]. Пасля заканчэння рэфармавання канцылярыі

---

2 Н.А. Максимейко, *Сеймы... Приложение,* op. cit., с. 54.

3 Документы Московского архива Министерства юстиции [далей – ДМАМЮ]. Т. 1 Довнар–Запольский М. Москва 1897, с. 514; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі [далей – НГАБ], КМФ-18, Метрыка Літоўская, воп. 1, спр. 7, арк. 919–920.

4 ДМАМЮ, с. 517; Н.А. Максимейко, *Сеймы... Приложение,* op. cit., с. 72; НГАБ, КМФ-18, воп. 1, спр. 7, арк. 937, 967.

5 А.І. Груша, *Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гахоў XV – першай паловы XVI ст.,* Мінск 2006, с. 45; Ч.Э. Будзька, *Кніжка об Івашку Гарнастаю,* т. 1, Чыкага 1955, с. 1.

6 А.І. Груша, *Канцылярыя...*, op. cit., с. 65, 150–151.

7 А.І. Груша, *Канцылярыя...*, op. cit., с. 65; Ч.Э. Будзька, *Кніжка...*, op. cit., с. 23.

ВКЛ у 1522–1523 гг., калі ўрад вышэйшага пісара спалучаўся са службовымі абавязкамі «земскага» падскарбія, Іван Гарнастай ужо паўторна з'яўляўся пісарам з 1522 г.[8] Трэба адзначыць, што пісары на паседжаннях Паноў-Рады выконвалі выключна тэхнічныя функцыі[9]. У чэрвені 1522 г. Іван Гарнастай у межах пасольства ВКЛ адправіўся да маскоўскага князя Васіля III Іванавіча для заключэння міру[10]. Таксама ў 1529 г. менавіта праз Івана Гарнастая праходзілі чарговыя перамовы з Маскоўскім княствам па пытанню замацавання межаў паміж дзяржавамі[11].

Па маёмаснаму палажэнню Іван Гарнастай, згодна з Попісам 1528 г., быў уладальнікам 80 сялянскіх «службаў», з якіх выстаўляў 10 коней, а таксама 96 застаўленых «службаў», з якіх выстаўляў 12 коней[12]. Гэта сведчыць аб даволі заможным статусе гэтага чалавека, што так ці інакш мела ўплыў на яго далейшую кар'еру.

Актыўная палітычная дзейнасць Івана Гарнастая дазволіла яму пастунова атрымаць урады дзяржаўцаў дарсунішскага (1527 г.) і зэльвенскага (1535 г.), старастаў слонімскага (1531 г.) і мсцібогаўскага (1534 г.)[13]. Ужо з 1530 г. Іван Гарнастай займаў урад земскага падскарбія «да жывата», па сумяшчальніцтве быў і вышэйшым пісарам, а ў 1530–1541 гг. з'яўляўся гаспадарскім маршалкам[14]. Давер з боку Жыгімонта Старога дазволіў Івану Гаснастаю інтэгравацца ў двор манарха (нават пры Жыгімонце Аўгусце) і займаць з 1542

[8] J. Wolff, *Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. 1386–1795,* Kraków 1885, s. 262, 266–267; А.І. Груша, *Канцылярыя…*, op. cit., с. 151.

[9] А.І. Груша, *Канцылярыя…*, op. cit., с. 57.

[10] Ч.Э. Будзька, *Кніжка…*, op. cit., с. 71.

[11] Ч.Э. Будзька, *Кніжка…*, op. cit., с. 244–248, 269–273.

[12] *Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга публічных спраў 1*, Груша А.І., Спірыдонаў М.Ф., Вайтовіч М.А. Мінск 2003, с. 37.

[13] М.К. Любавский, *Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства,* Москва 1900, с. 338.

[14] J. Wolff, *Senatorowie…*, op. cit., s. 185; А.І. Груша, *Канцылярыя…*, op. cit., с. 71; Ч.Э. Будзька, *Кніжка…*, op. cit., с. 295–297, 325; М. К. Любавский, *Литовско-русский сейм…*, op. cit., с. 338.

па 1558 гг. урад дворнага маршалка[15]. Больш за тое, калі пасада троцкага ваяводы была вакантна, Іван Гарнастай у 1540–1541 гг. часова выконваў абавязкі па гэтаму ўраду[16]. Падчас адсутнасці асобы на пасадзе віленскага ваяводы Іван Гарнастай у 1549–1551 гг. з'яўляўся спраўцам Віленскага ваяводства[17]. Нарэшце назапашаны досвед дазволіў Івану Гарнастаю з 1551 па 1558 гг. паўнавартасна займаць урад навагрудскага ваяводы[18]. Памёр Іван Астаф'евіч Гарнастай у маі 1558 г.

Такім чынам, Іван Гарнастай, дзякуючы актыўнай дзейнасці, паступова павышаў свой палітычны статус у ВКЛ і змог дамагчыся даверу з боку Жыгімонта Старога. Гэта спачатку прывяло Івана Гарнастая да рэалізацыі функцый гаспадарскага пасла ў парламецкім жыцці ВКЛ у 1530-ыя гг., а ў далейшым да яго інтэграцыі ў манаршый двор і у Паны-Рада праз замяшчэнне ваяводскіх урадаў.

У 1530-ыя гг. Жыгімонт Стары сканцэнтраваў сваю ўвагу на палітычным жыцці Польскага Каралеўства, таму ён даволі часта адсутнічаў у ВКЛ. Склалася сітуацыя, калі паседжанні Сойма ВКЛ нікім не ўзначальваліся. Тым больш, што вялікі князь меў права вырашальнага голасу. Зноў узнікла патрэба ў функцыянаванні інстытута гаспадарскага пасла. У дадзены перыяд яго абавязкі выконваў Іван Астф'явіч Гарнастай.

Звернем увагу на завочную камунікацыю паміж манархам і Соймам у 1531, 1532 і 1538 гг. Так, у 1531 г. з Кракава ад імя Жыгімонта Старога было адпраўлена пасольства земскага падскарбія Івана Гарнастая да Паны-Рады ВКЛ (М. В. Доўнар-Запольскі датаваў дакумент гэтага пасольства «1528 годам», у той час як М.А. Максімейка абгрунтаваў дату «1531 год»)[19]. У гэтым пасольстве ўказвалася Панам-Радзе на Сойме прыняць пастановы аб арганізацыі абароны

[15] J. Wolff, *Senatorowie…*, op. cit., s. 179.

[16] Ibidem, s. 58.

[17] Ibidem, s. 73.

[18] Ibidem, s. 37.

[19] ДМАМЮ, с. 525; Н.А. Максимейко, *Сеймы… Приложение*, op. cit., с. 83.

Княства. Найперш гэта тычылася межаў з Крымскім ханствам, якому ВКЛ і Польшча адмовіліся плаціць «упамінкі». Гаварылася аб выплаце падаткаў на ваенныя патрэбы, а таксама аб вызваленні закладзеных вялікакняскіх маёнткаў. Таксама ўказвалася ў выпадку нявыплаты падаткаў канфіскаваць маёнткі на карысць скарбу. У той жа час падатковая норма складала з кожнай «службы» па 2 грошы (з «каня» па 16 грошаў). У пасольстве была абазначана неабходнасць у правядзенні мерапрыемстваў па ўмацаванні кіеўскага замка, а таксама гарадоў Орша, Мсціслаў, Крычаў. Пры гэтым ураднікам на прускай і інфлянцкай межах прадпісвалася ахоўваць межы Вялікага Княства. Яшчэ адным важным пытаннем было заключэнне чарговага перамір’я з Маскоўскай дзяржавай, паколькі тэрмін папярэдняга заканчваўся. Прапаноўвалася выбраць паслоў з ліку радных паноў для адпраўкі іх у Маскву. Казалася, што манарх сфармулюе «навуку» па пытанню адносін з Маскоўскім княствам. Акрамя гэтага, Іван Гарнастай ад імя вялікага князя ўказваў адмяніць мыта паміж палачанамі і рыжанамі, а таксама палепшыць дарогі з Полацка і Вільні да Рыгі. Асобнае пытанне датычылася соймавых паседжанняў. У пасольстве гаварылася аб правядзенні «судавога» Сойма два разы на год у Вільні, каб прадстаўнікі памежных земляў Княства (Полацк, Віцебск, Кіеў, Жамойць, Валынь) маглі выкарыстаць добры стан дарог да сталіцы. У заключэнні было ўказана, каб Паны-Рада на Сойме зрабілі пастанову аб «земскай» службе і правялі азнаямленне ваеннаабавязаных з гэтай «уфалай». У выпадку няяўкі ў склад войска меркавалася канфіскацыя маёмасці[20].

У 1532 г. наступнае пасольства ад Жыгімонта Старога таксама ўзначаліў падскарбій земскі, маршалак, пісар і дзяржаўца слонімскі Іван Гарнастай (М. В. Доўнар-Запольскі датаваў гэты дакумент «1529 годам»)[21]. Іван Гарнастай на Віленскі Сойм перадаваў

---

[20] ДМАМЮ, с. 525–530.

[21] Акты Литовско-Русского государства (1390–1529) [далей – АЛРГ]. Вып. 1 Довнар-Запольский М.В. Москва 1899, с. 240; Н.А. Максимейко, *Сеймы… Приложение*, op. cit., с. 84.

наступныя ўказанні вялікага князя для Паноў-Рады. Перш за ўсё гэта было прызначэнне «вялікіх» паслоў для заключэння перамір'я з Маскоўскай дзяржавай на 3–4 гады. Асобныя ўказанні тычыліся полацкага ваяводы, дарагіцкага старасты, ожскага і пераломскага дзяржаўцы Пятра Станіслававіча, а таксама віцебскага ваяводы і маршалка Яна Юравіча Глябовіча. Гаварылася аб неабходнасці ўмацавання памежных замкаў[22]. Падобныя ўказанні маглі зыходзіць з таго, што на той момант яшчэ не было вырашана пытанне наконт перамір'я паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам.

У лютым 1538 г. адбываліся паседжанні Петракоўскага і Віленскага Соймаў. Жыгімонт Стары тады знаходзіўся ў Петракове. Таму для вырашэння спраў Княства паміж двума паседжаннямі была наладжана камунікацыя. Ад імя манарха было арганізавана чарговае пасольства падскарбія земскага, маршалка і пісара Івана Гарнастая. У пасольстве на Віленскі Сойм перадавалася «ласка гаспадарская». На гэты раз указвалася на выплату «упамінак» на тры гады крымскаму хану. Для арганізацыі абароны меркавалася, што ваяводы, старасты і дзяржаўцы абяруць па два земяніны і з харужымі паветаў прыедуць на паседжанне Сойма ў Вільню. Пры гэтым манарх адзначаў, што на Сойме трэба абмеркаваць пытанне чарговага перамір'я з Маскоўскай дзяржавай[23].

У чэрвені таго ж 1538 г. было адпраўлена яшчэ адно пасольства з Кракава падскарбія земскага, маршалка, пісара, старасты слонімскага і мсцібогаўскага, дзяржаўцы дарсунішскага і зэльвенскага Івана Гарнастая. У ім гаварылася, што па прыбыцці на Віленскі Сойм неабходна ўказаць Панам-Радзе на наступныя падатковыя нормы: з «каня» ці 8 «службаў» па 20 грошаў. З гэтых грошай меркавалася накіраваць на памежныя замкі тысячу коннікаў. Пры гэтым другая тысяча накіроўвалася за кошт манарха ў Кіеў[24]. Ужо

[22] АЛРГ, с. 240–242.

[23] Н.А. Максимейко, *Сеймы… Приложение*, op. cit., с. 94–97; НГАБ, КМФ-18, воп. 1, спр. 7, арк. 182 адв. – 183 адв.

[24] Н.А. Максимейко, *Сеймы… Приложение*, op. cit., с. 97.

ў верасні 1538 г. было адпраўлена чарговае пасольства Івана Гарнастая да радных паноў у Наваградак. У ім звярталася ўвага на выкананне рашэнняў мінулага Віленскага Сойма. Яны тычыліся арганізацыі абароны і фінансаў (перш за ўсё супраць татараў) і заключэнне перамір'я тэрмінам на 5 гадоў з Маскоўскай дзяржавай[25].

З 1540-х гг. у парламенцкай практыцы ВКЛ склалася практыка прысутнасці вялікага князя на соймавых паседжаннях, якая канчаткова зацвердзілася ў эпоху Жыгімонта Аўгуста. Адпаведна, адпала неабходнасць у наладжванні камунікацыі паміж адсутным у Княстве манархам і Соймам ВКЛ.

Падсумоўваючы належыць адзначыць, што ў кампетэнцыі гаспадарскага пасла ўваходзіла наладжванне камунікацыі паміж вялікім князем і Соймам ВКЛ. Праз Івана Гарнастая Жыгімонт Стары інфармаваў і вырашаў пытанні арганізацыі абароны і фінансаў дзяржавы, адносін ВКЛ з суседзямі. Больш за тое, гаспадарскі пасол такім спосабам забяспечваў сімвалічную «прысутнасць» вялікага князя на паседжанні Сойма ВКЛ.

Варта таксама адзначыць, што ў 1500–1530-ыя гг. у палітычнай практыке ВКЛ праяўляецца давер манарха да асобы палітыка. Кар'ерны шлях Івана Гарнастая яскравы гэтаму прыклад. У 1510–1520-ыя гг. Іван Гарнастай пачынаў як пісар у канцылярыі ВКЛ, пры гэтым ён выконваў важныя знешнепалітычныя даручэнні манарха і ўдзельнічаў у пасольстве Мікалая Вежгайлы на Соймы ВКЛ. Паступова Іван Гарнастай займаў урады дзяржаўцаў і старастаў, а ў 1530-ыя гг. – адныя з важнейшых дзяржаўных ўрадаў земскага падскабія і гаспадарскага маршалка. Менавіта ў гэты час Іван Гарнастай узначальваў пасольствы Жыгімонта Старога на паседжанні Сойма ВКЛ. У выніку Іван Гарнастай у 1540–1550-ыя гг. змог інтэгравацца ў палітычная колы двара манарха праз урад дворнага маршалка і выконваць ваяводскія абавязкі ў Троках і Вільні, а пасля атрымаць уласны пасаду наваградскага ваяводы.

---

[25] *Русская историческая библиотека [РИБ],* [в:] *XL т. Т. XXX,* Лаппо И.И., Юрьев 1914, с. 1–11.

Функцыянал Івана Гарнастая як гаспадарскага пасла ў 1530-ыя гг. заключаўся ў наладжванні камунікацыі паміж адсутным у Княстве Жыгімонтам Старым і Соймам ВКЛ. З аднаго боку, гэта дазваляла манарху дэклараваць і вырашаць найбольш актуальныя пытанні для дзяржавы. У першую чаргу, гэта былі: арганізацыя абароны і фінансаў Княства, узаемаадносіны ВКЛ з Маскоўскім княствам і Крымскім ханствам. Акрамя таго, праз такія пасольствы рэгламенталіся прадстаўнічыя нормы ў парламецкім жыцці Вялікага Княства. З другога боку, інтытут гаспадарскага пасла дазваляў забяспечваць сімвалічную «прысутнасць» вялікага князя на агульнадзяржаўных паседжаннях ВКЛ, такім чынам робячы манарха ўдзельнікам Соймаў.

## Bibliografia

*Akty Litovsko-Russkogo gosudarstva (1390–1529). Vyp. 1,* Dovnar-Zapol′skij M.V. Moskva 1899 [*Акты Литовско-Русского государства (1390–1529). Вып. 1,* Довнар-Запольский М.В. Москва 1899].

Budz’ka Č.È., *Knižka ob Ivašku Garnastaû. T. 1,* Čykaga 1955 [Будзька Ч.Э., *Кніжка об Івашку Гарнастаю. T. 1,* Чыкага 1955].

*Dokumenty Moskovskogo arhiva Ministerstva ûsticii. T. 1,* Dovnar-Zapol′skij M., Moskva, 1897 [*Документы Московского архива Министерства юстиции. T. 1,* Довнар–Запольский М., Москва 1897].

Gruša A.I., *Kancylâryâ Vâlikaga knâstva Litoǔskaga 40-h gahoǔ XV – peršaj palovy XVI st.,* Mìnsk 2006 [Груша А.І., *Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гахоў XV – першай паловы XVI ст.,* Мінск 2006].

Lyubavskij M.K., *Litovsko-russkij sejm: opyt po istorii uchrezhdeniya v svyazi s vnutrennim stroem i vneshnej zhiznyu gosudarstva,* Moskva 1900. [Любавский М.К., *Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства,* Москва 1900].

Maksimejko N.A., *Sejmy Litovsko-russkogo gosudarstva do Lûblinskoj unii 1569 g.,* Har’kov 1902 [Максимейко Н.А., *Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г.,* Харьков 1902].

Malinovskiy I., *Rada Velikogo Knyazhestva Litovskogo v svyazi s boyarskoy dumoy drevney Rossii: v dvukh chastyakh. Ch. 2,* Tomsk 1911 [Малиновский И., *Рада Великого Княжества Литовского в связи с боярской думой древней России: в двух частях. Ч. 2,* Томск 1911].

Natsyyanalny Gistarychny Arkhiu Belarusi, KMF-18, Metryka Lìtoǔskaâ, vop. 1, spr. 15 [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, КМФ-18, Метрыка Літоўская, воп. 1, спр. 7].

Natsyyanalny Gistarychny Arkhiu Belarusi, KMF-18, Metryka Lìtoǔskaâ, vop. 1, spr. 15 [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, КМФ-18, Метрыка Літоўская, воп. 1, спр. 15].

*Perapìs vojska Vâlìkaga Knâstva Lìtoǔskaga 1528 goda. Metryka Vâlìkaga Knâstva Lìtoǔskaga. Knìga 523. Knìga publìčnyh sprаŭ 1,* Gruša A.Ì., Spìrydonaŭ M.F., Vajtovìč M.A., Mìnsk 2003 [*Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга публічных спраў 1,* Груша А. І., Спірыдонаў М. Ф., Вайтовіч М. А., Мінск 2003].

*Russkaâ istoričeskaâ biblioteka:* [v:] *XL t. T. XXX,* Lappo I.I., Ûr'ev 1914 [*Русская историческая библиотека,* [в:] *XL т. Т. XXX,* Лаппо И.И., Юрьев 1914].

Wolff J., *Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. 1386–1795,* Kraków 1885.

## Features of the functioning of the Sejm of the Grand Duchy of Lithuania in the 1530s, based on the example of the activities of the Hospodar ambassador Ivan Hornostay

The article is devoted to the problems of the functioning of the Sejm of the Grand Duchy of Lithuania in the 1530s. The features of the functioning of the Sejm of the Grand Duchy of Lithuania in this period are revealed using the example of the activities of the Hospodar's ambassador Ivan Hornostay. The author showed the specific practice in the parliamentarism of the Grand Duchy of Lithuania in the 1500–1530s, when Sigismund the Old was absent from the state, and his «presence» at the Sejm's sessions was ensured by the Hospodar's ambassadors. In the 1530s, the functions of the Hospodar's ambassador were performed by Ivan Hornostay. The article showed the gradual development of Ivan Hornostay's political career in the Grand Duchy of Lithuania, in which three stages were distinguished. The functionality of Ivan Hornostay as the Hospodar's ambassador was also revealed. His competence included establishing communications between the monarch and the Sejm of the Grand Duchy of Lithuania, with the help of which Sigismund the Old exercised his powers within the framework of organizing the defense and finances, relations with the Moscow State and the Crimean Khanate.

Keywords: Sejm, Grand Duchy of Lithuania, ambassador, Ivan Hornostay, parliamentarism